педагагічных, арганізатарскіх. Дамінуючымі ў палітры здольнасцей рэжысёра самадзейнага тэатральнага калектыву з'яўляюцца цесна звязаныя між сабой педагагічныя і арганізатарскія якасці.

Развіццю прафесійных здольнасцей найбольш спрыяе інтэграцыя калектыўнай і індывідуальнай творчасці, якая мае права на азначэнне як калектыўна-індывідуальная.

Арганізацыя калектыўна-індывідуальнай творчасці на занятках па рэжысуры можа мець месца толькі пры пэўных псіхолага-педагагічных умовах. Галоўная з іх наступная: прадмет рэжысуры павінен існаваць ва ўмовах найбольшай набліжанасці вучэбнай групы да работы тэатральнага калектыву, у якім усе пытанні вырашаюцца пры актыўным удзеле кожнага члена калектыву.

Мэта кіраўніка - садзейнічаць кожнаму кроку. Для гэтага неабходна наступнае.

- Усе педагагічныя, мастацкія мэты павінны быць адзінымі; калектыўная творчасць і развіццё асобы могуць быць толькі ў атмасферы добразычлівасці, патрабавальнасці, прынцыповых адносін да пэўных жыццёвых з'яў, фактаў, падзей.

- Кожны творчы крок, пошук таго ці іншага вырашэння любой праблемы павінны знаходзіць падтрымку і станоўчую ацэнку, нават калі пазней знойдзецца больш цікавая прапанова.

- Важнае месца павінен займаць дыскусійны прынцып. Прынцыпе пэўнай прапановы даказваецца, узгадняецца з усімі ўдзельнікамі калектыву.

- Свабода выказванняў пры цярпімасці розных думак.

Калектыўная мастацкая творчасць магчыма, калі існуе павага кіраўніка як да ўсяго калектыву, так і да кожнай асобы, існуе ўзаемная вера ў здольнасці кожнага.

Развіццю здольнасцей студэнта-рэжысёра шляхам арганізацыі калектыўнай і індывідуальнай творчасці садзейнічаюць канкрэтныя прыклады фарміравання і ажыццяўлення задумы эцюда, нумара, прадстаўлення, спектакля з улікам трох пазіцый: 1) фарміраванне калектыву ў цэлым і актывізацыя творчых магчымасцей кожнага студэнта; 2) агульнае прафесійнае развіццё студэнта з выкарыстаннем прынятай методыкі; 3) улік якасцей кіраўніка курса, педагога, якія неабходны для ажыццяўлення метаду калектыўна-індывідуальнай творчасці і развіцця прафесійных здольнасцей рэжысёра-педагога.

Арганізацыя калектыўна-індывідуальнай творчасці на занятках па рэжысуры садзейнічае фарміраванню наступных якасцей студэнтаў: актыўнай жыццёвай пазіцыі, зацікаўленасці прафесіяй, працаздольнасці, калектывізму, пачуцця адказнасці. Акрамя таго, гэта творчасць удасканальвае педагагічныя і арганізацыйныя здольнасці навучэнцаў, паляпшае маральна-псіхалагічны клімат ў групе.

Юркевіч В.І.,
выкладчык

## УЗАЕМАСУВЯЗЬ ТВОРЧЫХ МЕТОДЫК У ПРАЦЭСЕ ВЫХАВАННЯ І РАЗВІЦЦЯ АСОБЫ СТУДЭНТАЎ І НАВУЧЭНЦАЎ СЯРЭДНІХ ШКОЛ

Праблема выхавання асобы - адна з найбольш складаных і вострых. Вынікі яе распрацоўкі знайшлі адлюстраванне ў многіх выданнях, дзе чалавек разглядаецца ў самых розных аспектах: філасофскім, сацыялагічным, псіхалагічным і інш. Але маральнаму аспекту ўдзяляецца недастатковая ўвага. Мараль можа функцыянаваць ў грамадстве пры ўмове, калі грамадскія патрабаванні прымаюцца, адабраюцца, захоўваюцца членамі гэтага грамадства, калі патрэба ў маральнасці становіцца ўласцівасцю кожнага чалавека. Узаемаадносіны людзей нараджаюць патрэбнасці ва ўзаемадапамозе, любові, сяброўстве, шчасці, у пошуках сэнсу жыцця. Задавальненне гэтых патрэбнасцей немагчыма без развіцця ў людзей чуласці, без павагі ўласнай і чужой годнасці, пачуццяў сумлення, гонару, адказнасці, абавязку. Выхаваць сапраўды духоўныя патрэбы асобы - цяжкая, комплексная задача. Духоўнае багацце, агульная культура людзей ёсць не толькі вынік уздзеяння на іх знешняга асяроддзя, але і прадукт самавыхавання, самаразвіцця.

Ёсць пэўная неадпаведнасць паміж ростам інтэлектуальнага развіцця моладзі і яе эстэтычнай адукацыяй. Для паспяховага вырашэння данай праблемы неабходны тэарэтычныя і практычныя дысцыпліны ў школах, гімназіях, ліцэях. Гэта этыка, прадметы па музычна-рытмічнаму, фізічнаму выхаванню і інш. У нашым універсітэце гэта акцёрскае майстэрства, культура руху, культура мовы, этыкет, фальклор і інш.

У творчасці раскрываюцца таленты, імкненні чалавека. Творчасць як калектыўная, так і індывідуальная разглядаецца намі праз маральна-псіхалагічныя аспекты.

Творчасць неабходна разумець шырока, менавіта як развіццё і аб'ектывізацыю ўсіх духоўных сіл чалавека.

Практыка пераконвае, што дзеля таго, каб стаць спецыялістам, прафесіяналам сваёй справы, мала атрымаць вышэйшую адукацыю. Неабходна умець выразна, вобразна, эмацыянальна і пераканаўча гаварыць, рытмічна рухацца, пластычна валодаць сваім целам. Правільныя манеры паводзін - гэта строга вы-

значаны стыль, правілы адносін у грамадстве.

Сёння неабходна павышаць узровень культуры мовы, культуры руху, якія з'яўляюцца састаўной часткай агульнай культуры чалавека. У гэтай важнай справе вялікая адказнасць ускладаецца на настаўнікаў сярэдніх школ і выкладчыкаў ВНУ. Ад іх прадуманага, мэтанакіраванага дзеяння, ад узроўню іх уласнай культуры ў многім залежыць і ўзровень культуры іх выхаванцаў.

Задача выкладчыкаў - даваць веды, якія выхоўваюць душу чалавека. У нашых школах творчыя дысцыпліны вядуцца толькі калектыўным метадам, што не дае магчымасці поўна раскрыць асобу дзіцяці, яго творчую ініцыятыву, індывідуальнасць. Таму асаблівым прыкладам для вучняў з'яўляюцца настаўнікі. На жаль, не ва ўсіх іх ёсць творчы пачатак. А асновы творчасці неабходна закладваць менавіта ў школе. Вырашыць гэту праблему змогуць нашы выпускнікі, будучыя спецыялісты, якія ва універсітэце вучацца раскрыццю індывідуальнасці вучня, яго творчага патэнцыялу.

Выхаваць сапраўдныя маральныя якасці ў асобы - цяжкая і комплексная задача. Ад таго, якімі патрабаваннямі кіруецца чалавек, залежаць яго існаванне, спосаб жыцця, накірунак дзейнасці, характар адносін з іншымі людзьмі.

Аляхновіч А.М.,
дацэнт

## СПЕЦЫФІКА ВЫВУЧЭННЯ ФАЛЬКЛОРУ З БУДУЧЫМІ РЭЖЫСЁРАМІ СВЯТ

Вывучэнне фальклору з будучымі рэжысёрамі свят павінна праходзіць у спалучэнні тэорыі і практыкі. Тэарэтычныя аспекты ведаў фальклору будучых рэжысёраў вызначаюцца мастацкімі задачамі, уласцівымі для канкрэтнага свята. Вельмі важна, працуючы над раскрыццем мастацкіх асаблівасцей свята, раскрыць тэму і ідэю народных песень, якія будуць выкарыстоўвацца ў свяце. Менавіта пранікненне рэжысёра ў атмасферу песні, вызначэнне яе характару, адчуванне паэтыкі, настрою дапамогуць яму ў пошуках раскрыцця асаблівасцей свята разнастайнымі мастацкімі сродкамі: пластыка-харэаграфічнымі, дэкаратыўна-мастацкімі, драматычнымі, мімічнымі і інш.

Раскрыць тэму і ідэю народнай песні - задача даволі складаная для рэжысёра. Асабліва гэта няпроста зрабіць у адносінах да песень лірычных. Рэжысёру трэба вызначыць для сябе, што ж хацеў сказаць народ у канкрэтным фальклорным творы. Толькі высветліўшы гэтае пытанне, можна пачаць работу над мастацкім вобразам нумара.

Што тычыцца выкарыстання ў свяце іншых жанраў фальклору, то рэжысёру вельмі важна ведаць іх вобразную і мастацкую прыроду. Менавіта веданне гэтых спецыфічных асаблівасцей фальклорных жанраў дапаможа яму знайсці ключ для вырашэння шматлікіх мастацкіх задач.

Агульныя мастацкія задачы, якія ўзнікаюць перад рэжысёрам пры арганізацыі і правядзенні свят, вызначаюць і перад выкладчыкам пэўныя тэарэтычныя праблемы ў выкладанні фальклору будучым рэжысёрам.

Практычныя веды фальклору будучымі рэжысёрамі свят павінны ўключаць выкананне перш за ўсе каляндарна-абрадавых песень. Гэта задача зусім рэальная, калі ўлічыць, што народныя каляндарна-абрадавыя песні, як правіла, аднагалосныя. Іх выкананне не патрабуе якой-небудзь спецыяльнай падрыхтоўкі. Пры жаданні гэтыя творы, як паказвае практыка, могуць выконвацца на даволі высокім мастацкім узроўні рэжысёрамі свят. Авалоданне каляндарна-абрадавымі песнямі дапамагае рэжысеру больш кампетэнтна выкарыстоўваць фальклор у свяце, надаць яму адметную спецыфіку з улікам рэгіянальнай асаблівасці традыцыйнай спадчыны.

Зусім рэальнай задачай для будучых рэжысёраў свят з'яўляецца авалоданне асновамі выканання на народных інструментах: дуды, жалейцы, гармоніку і інш. Справа пры гэтым заключаецца ў тым, каб у вучэбным плане кафедры рэжысуры свят былі прадугледжаны заняткі па авалоданню ігрой на народных інструментах будучымі рэжысёрамі і наяўнасць гэтых інструментаў на кафедры.

На наш погляд, менавіта спалучэнне тэорыі і практыкі ў вывучэнні фальклору, у прыватнасці музычнага, будучымі рэжысёрамі свят - гэта галоўны напрамак пры арганізацыі вучэбнага працэсу па засваенню традыцыйнай спадчыны нашай Бацькаўшчыны.

Лапчынская Л.В.,
ст.выкладчык

## АСАБЛІВАСЦІ ВЫКЛАДАННЯ ПРАДМЕТА «МОЎНАЕ ДЗЕЯННЕ» БУДУЧЫМ РЭЖЫСЁРАМ СВЯТА

«Моўнае дзеянне» - навучальная дысцыпліна ў агульнай сістэме прафесійнай падрыхтоўкі рэжысёра свят. Мэтай яе з'яўляецца спасціжэнне законаў моўнага дзеяння ў розных літаратурных жанрах (вершы, проза, байкі, фальклорны і спеўны матэрыял і г.д.). Слова ў свяце нясе асноўны сэнс. Уключэнне ў народнае свята вуснай творчасці, міфалогіі прадугледжвае валоданне арфаэпічнымі нормамі, дыялектнымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ